**Рынкевіч, К.** Сапраўдны палкоўнік з Міёрскага краю / К. Рынкевіч // Міёрскія навіны. — 2021. — 23 лют. — С. 5.

## САПРАЎДНЫ ПАЛКОЎНІК З МІЁРСКАГА КРАЮ

*Вайсковай службе **Пётр ПІРОГ** прысвяціў 28 гадоў. За ўдзел у баявых дзеяннях у Афганістане ўзнагароджаны Ордэнам Чырвонай зоркі, медалямі «Ад удзячнага афганскага народа» і «10 гадоў Саурскай рэвалюцыі».*



*У школе сябры і аднакласнікі з іроніяй называлі Пятра афіцэрам, ведаючы пра яго намер стаць ваенным і не верачы ў поспех. Аднакурснікі ў вучылішчы нараклі журналістам, паколькі вёў журнал курса. У вучобе і на службе не пасаваў перад цяжкасцямі. Падчас прыёмнай камісіі адзін з афіцэраў ахарактарызаваў юнака: «Такі, калі трэба, і пад свае танкі кінецца».*

### Чаканая сустрэча, цікавая размова

З нашым земляком, палкоўнікам у адстаўцы Пятром Пірагом мяне пазнаёміла журналістка з Расіі Людміла Цвяткова. Супрацоўніца чарапавецкай раённай газеты «Сельская новь» даслала матэрыял пра маці Пятра Паўлавіча – Надзею Раманаўну Пірог (Барэйка), вязня канцлагера Равенсбрук (матэрыял апублікаваны ў «Міёрскіх навінах» № 37 за 8 мая 2020 года). Дамовіліся, што некалькі нумароў газеты перадам Пятру Пірагу, калі наведаецца на Міёршчыну. Раз на год ён прыязджае ў родныя лявонпальскія мясціны пабачыцца са сваякамі, наведаць магілы бацькоў, пахадзіць знаёмымі сцежкамі.

Наша сустрэча адбылася ў мінулым ліпені. Дзверы рэдакцыі адчыніў сапраўдны палкоўнік. У свае 67 гадоў бадзёры і падцягнуты, рухавы і энергічны, з гучным цвёрдым голасам і добрай усмешкай. У руках – шыкоўны букет кветак і падарункавы набор ласункаў.

Тры непрыкметныя гадзіны гутарылі з былым вайскоўцам пра яго дзяцінства ў вёсцы Балтрукі, пра курсанцкія будні, службу ў Германіі, на Далёкім Усходзе, у Афганістане, пра цяперашнія сямейныя радасці і клопаты ў Бабруйску.

### Бог заўжды побач

«Нават калі ты мяне не ведаў, і тады я цябе прыпаясваў». Да гэтых слоў са Святога Пісання субяседнік не раз звяртаўся падчас гутаркі. Пётр Паўлавіч жыве з Богам у сэрцы. Свядома прыйшоў да веры. Азіраючыся на пражытае, зразумеў, што ва ўсім яго накіроўвала Божая рука.

– Калі ў самалёце адвальваецца крыло, адразу ўсе вернікамі становяцца. А на зямлі – па выбары, – заўважае Пётр Пірог. – У мяне вера, напэўна, у генах закладзена. Маці памятаю ў малітве. Яе родная сястра Вера выйшла замуж за святара, які ў свой час быў настаяцелем царквы ў Оршы. У маёй сям'і ўсе вернікі.

### Хлеб елі, нібы шакалад

Дзяцінства Пятра прайшло ў месцейку Балтрукі, што ў ваколіцах Лявонпаля. У 60-я гады ў вёсцы налічвалася каля 30 двароў. Цяпер засталася толькі труба ад цагельнага завода, якім калісьці кіраваў бацька Пятра.

– Спачатку наша сям'я ў Трудах жыла, што таксама ва Узмёнскім сельсавеце, – распавядае субяседнік. – Тата быў добрым будаўніком. Яго накіравалі на вучобу ў Віцебск, дзе скончыў курсы керамікі, затым прызначылі дырэктарам цагельнага завода ў Балтруках, куды мы і пераехалі. Маці вяла хатнюю гаспадарку, нас з братам даглядала.

У школу хадзілі ў Лявонпаль за тры кіламетры. Па дарозе дадому заходзілі ў магазін. Духмяны хлеб быў смачны, нібы шакалад. І каштоўны, бо шмат не купіш. На чалавека паўбохана адпускалі.

Урокі Пеця рыхтаваў пры керасінавай лямпе. Калі вучыўся ў трэцім класе, з'явілася электрычнасць. Прыгадвае, як здзіўляліся сяльчане, пачуўшы з вакон іх дома радыёперадачу. Яны першыя ў вёсцы займелі прыёмнік на батарэйках.

Сельскія хлапчукі змалку прывучаліся да працы. Пётр умеў і сена накасіць, і карову падаіць, і каня запрэгчы.

**Словы маці запалі ў душу**

Стаць ваенным Пеця вырашыў у восем гадоў. На Дзень Перамогі разам з многімі вяскоўцамі на мітынгу ў Даўгінаве ён слухаў расповяд маці пра жудасныя пакуты ў канцлагеры. Уразлівую дзіцячую душу захлынула жаданне хутчэй вырасці і адпомсціць ворагам.

Дарэчы, праходзячы службу ў Германіі, Пётр Паўлавіч наведаў мемарыяльны комплекс на тэрыторыі былога канцлагера ў Равенсбруку.

**Просты сельскі хлопец – курсант**

З 1970 па 1974 гады Пётр Пірог – курсант Ленінградскага вышэйшага агульнавайсковага каманднага двойчы чырванасцяжнага ваеннага вучылішча імя С. М. Кірава. У тым, што на экзаменах траплялiся білеты, якія найлепш ведаў, што прыёмная камісія заўважыла ў ім адказнасць і ўпартасць, бачыць Божы промысел.

– Вельмі хваляваўся перад мандатнай камісіяй. Я – просты сельскі хлопец з беларускай глыбінкі, разам са мной паступаюць сыны, унукі ці пляменнікі ваенных з высокімі званнямі, – прыгадвае палкоўнік у адстаўцы. – Кажу нашаму камандзіру роты маёру Сачэнка: *«Нас пастрыглі нагала. Калі не паступлю, як мне ў такім выглядзе дадому вяртацца?»* Той запэўніў, што ўсё будзе добра. На камісіі шмат пытанняў мне не задавалі. А маёр Сачэнка падняў руку і гаворыць: *«Я з гэтым хлопцам размаўляў, і ён сказаў, што пакуль валасы не адрастуць, адсюль не паедзе»*. У гэты момант мне хацелася падбегчы да яго і абняць.

**Пірог смачней**

– Абрамовіч, Алёшкін, Акалбекаў, Багамаз, Букін, Весялоў, Вінаградаў, Гаўрылаў, Гуляеў…, – прозвішчы сваіх аднакурснікаў Пётр Пірог без запінкі называе па памяці ў алфавітным парадку. Відаць, паспрыяла тое, што вёў журнал паспяховасці. Гэтых абавязкаў дадаў Пятру яго прыгожы почырк.

Прыгадвае смешны выпадак на першых занятках па тактыцы.

– Аддаў выкладчыку журнал, сеў на сваё месца, а той кажа: *«Не буду вас па прозвішчах называць, прадстаўцеся самі, я ўсіх адзначу».* Дайшла чарга да мяне. Устаю:

– Курсант Пірог.

– Сядай. Два!

– За што?

– Ты што, жартаваць з мяне вырашыў? – злосна сказаў выкладчык, а затым зазірнуў у журнал і заўсміхаўся: – Сядайце, Ваша прозвішча смачней за маё.

Аказалася, прозвішча выкладчыка – Хлеб.

**Генералы казалі: «Дзякуй, сынок!»**

Вучылішча Пётр Пірог скончыў на «4»-кі і «5»-кі. Толькі адна «тройка» па вышэйшай матэматыцы. Не знайшоў агульную мову з гэтай дысцыплінай, ды і пасля яна не спатрэбілася.

Выпускніку прадаставілі самому выбраць месца службы. Параіўся з выкладчыкамі. Тыя адзначылі, што добры вопыт атрымае за мяжой. Так хлопец з Міёршчыны апынуўся ў групе савецкіх войск у Германіі. Прызначылі на пасаду начальніка разведкі асобнай часці. Пасля перавёўся ў мотастралковы полк, дзе камандаваў ротай. Праз пяць гадоў з Германіі накіравалі ў Далёкаўсходнюю ваенную акругу.

– Там таксама служба добра ішла. Мая рота была найлепшай у акрузе. «Дзякуй, сынок!», – казалі генералы, – распавядае субяседнік. – З часам мне прапанавалі пасаду начальніка штаба. Неўзабаве выйшла дырэктыва, згодна з якой начальнікаў штаба, што на пасадзе менш за год, трэба накіроўваць у Афганістан для атрымання практычных навыкаў.

**Бамбамёты з Міёр спяшаюцца на дапамогу**

У Афганістан Пётр Пірог трапіў у сакавіку 1987 года. На год месцам службы начальніка штаба стаў горад Кішым, што за 40 км ад граніцы з Пакістанам.

– Перад 1 мая кіраўніцтва паехала на зборы, я застаўся за камандзіра, – прыгадвае адзін выпадак Пётр Паўлавіч. – Па нас пачалі страляць, шэсць гадзін лупілі. Падначаленым я загадаў спусціцца ў бомбасховішча. Засталіся толькі адзінкі, каб у выпадку неабходнасці адбіць наступленне. Дакладваюць, што насупраць нас сабралася сур'ёзная варожая групіроўка і пытаюцца пра падтрымку авіяцыі. І тут я чую: *«Два бамбамёты з Міёрскага аэрадрома выйшлі».* Гэта так кранула: я ў Афганістане, родам з Міёршчыны і адтуль ляціць дапамога. Бамбамёты зрабілі вылет па ўказаных мной квадратах, і ўсё супакоілася. Пасля сабраў камандзіраў падраздзяленняў і спытаў, колькі ў нас страт. Аказалася – ніводнай, акрамя сабакі.

За кіраванне аперацыяй Пётр Пірог узнагароджаны Ордэнам Чырвонай зоркі.

– Пасля Афганістана ў мяне было права выбару ваеннай акругі. Вырашыў паехаць у Беларусь, – працягвае расповяд. – Службу скончыў у 1995 годзе камандзірам мотастралковага батальёна ў Бабруйску. Пасля вёў урокі спецпадрыхтоўкі ў школе, працаваў начальнікам аховы ваеннай нафтабазы.



**Родныя людзі побач**

Дні на пенсіі Пётр Пірог прысвячае сям'і. Нядаўна з жонкай **Ліліяй** адзначылі 45-годдзе сумеснага жыцця. Знаёмы з дзяцінства, разам вучыліся ў школе. Ажаніліся, калі Пётр скончыў вучылішча і стаў лейтэнантам.

– Атрымаў пад'ёмныя, купіў фату, сукенку і пярсцёнкі. Вяселле згулялі на малой радзіме, – расказвае ён. – У Германію адзін скіраваўся, а праз тры месяцы жонцы прыйшло запрашэнне, і яна да мяне прыехала. Усе сямейныя клопаты на ёй былі. Я на службу адыходзіў, цалаваў у шчочку дзяцей, якія яшчэ не прачнуліся, дадому вяртаўся – яны ўжо спалі.

Дарослыя дзеці са сваімі сем'ямі таксама пражываюць у Бабруйску. Сын **Андрэй** працуе вадзіцелем міжнародных рэйсаў. Дачка **Марына** скончыла Мінскі лінгвістычны ўніверсітэт, цяпер у водпуску па доглядзе дзіцяці. Усяго ў Пятра і Ліліі Пірагоў сем унукаў, малодшая **Даменіка** з'явілася на свет у мінулым годзе.

**На сувязі з саслужыўцамі і не толькі**

Даўно мінулі курсанцкія і вайсковыя будні, аднак таварышы па зброі працягваюць зносіны. Сацыяльныя сеткі спрасцілі пошук сяброў і далі магчымасць заставацца на сувязі, нягледзячы на адлегласць.

– Праз 45 гадоў пасля вучылішча мяне знайшоў у «Аднакласніках» аднакурснік **Юрый Вінаградаў**. Родам ён з горада Чарапавец, што на Валагодчыне, цяпер у Маскве жыве. Удзельнічаў у Чачэнскай вайне, – расказвае пра таварыша. – Праз Юрыя пазнаёміўся з журналісткай Людмілай Цвятковай, яны ў Чарапаўцы па суседству жылі. З ёй таксама пасябравалі, падтрымліваем зносіны праз інтэрнэт.

Мінулае лета для Пятра Пірага было багатым на паездкі і новыя ўражанні. Пасля традыцыйнага візіту ў Міёрскі край скіраваўся ў Расію на Валагодчыну сустрэцца з сябрамі. Падарожжа пакінула прыемныя ўспаміны.

**Кацярына РЫНКЕВІЧ**

**Фотаматэрыял з архіва Пятра ПІРАГА.**